Аналіз работы метадычнага аб’яднання класных кіраўнікоў за 2014-2015 навучальны год

Выхаваўчы працэс абумоўлівае новыя патрабаванні да прафесійнай падрыхтоўкі педагога. Павышэнне эфектыўнасці ідэалагічнай і выхаваўчай работы магчыма толькі пры ўдасканаленні сістэмы прафесійнай кампетэнцыі і інфармацыйнай культуры педагога. Ён павінен авалодаць мастацтвам весці дыялог і выводзіць дзіця на дыялог, уменнем прымаць дзіця як дадзенасць, выяўляючы да яго безумоўную павагу як да Чалавека, стварыць спрыяльныя ўмовы для самарэалізацыі асобы вучня і развіцця яго крэатыўнага мыслення.

Сярод разнастайных напрамкаў і форм павышэння кваліфікацыі педагогаў асаблівае месца займае метадычная работа, закліканая аказаць дапамогу класнаму кіраўніку і стварыць умовы для развіцця яго творчага патэнцыялу, яго педагагічнай індывідуальнасці. У 2014-2015 навучальным годзе змест работы МА быў накіраваны на рэалізацыю наступных задач:

- забяспечваць метадычнае суправаджэнне павышэнню прафесійнага майстэрства класных кіраўнікоў праз актыўнае выкарыстанне сучасных выхаваўчых тэхналогій;
- каардынаваць дзейнасць класных кіраўнікоў у арганізацыі работы класных калектываў;
- удасканальваць дзейнасць класных кіраўнікоў па фарміраванні культуры сямейных адносін, зберажэнні і ўмацаванні сямейных каштоўнасцей.

У 2014 -2015 навучальным годзе ў склад МА класных кіраўнікоў уваходзіла 13 класных кіраўнікоў (у 2013-2014 навучальным годзе 15 класных кіраўнікоў), педагог-арганізатар, педагог сацыяльны, выхавацель ГПД. Стаж работы класным кіраўніком звыш 15 гадоў у 7 настаўнікаў, звыш 10 гадоў у 2 настаўнікаў.

З пачатку навучальнага года класныя кіраўнікі працавалі па наступных накірунках:

- Арганізацыя сумеснага бацькоўска-дзіцячага культурнага дасугу (Кашкель М.У., класны кіраўнік 1 класа)
- Клуб «Этыкет» (Семяненя М.У., класны кіраўнік 2 класа)
- Экалагічны напрамак ( Міхаськова Г.Б., класны кіраўнік 5 класа)
- Краязнаўчы напрамак (Высоцкая В.К., класны кіраўнік 6 класа)
- Клуб “Выбар” (Баран М.С., Класны кіраўнік 9 класа)
- Клуб “Уроки будущим мужьям и жёнам»( Царык М.М. )
- Клуб “Время” (Белячыц В.А., класны кіраўнік 11а класа)
- Профарыентацыйная работа ( Амяльянчык М.С.).

На 2014-2015 навучальны год было запланавана 4 пасяджэнні МА. На першым пасяджэнні былі абмеркаваны асноўныя нарматыўныя дакументы: “Інструктыўна-метадычнае пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь “Асаблівасці арганізацыі і планавання ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў 2014-2015 навучальным годзе”, “ дэкрэт №18 Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, “ Программа непрерывного

воспитания детей и учащейся молодёжи в Республике Беларусь на 2011-2015 годы”, “ Концепция воспитания ОУ”. Класнымі кіраўнікамі сумесна з наменікам дырэктара па ВР Вільбік Т.С. быў распрацаваны план мерапрыемстваў па рэалізацыі напаўнення шостага школьнага дня на 2014-2015 навучальны год, план правядзення адзіных класных і інфармацыйных гадзін, праводзіўся інструктаж па вядзенню дакументацыі выхаваўчай работы, былі зацверджаны графік правядзення класных бацькоўскіх сходаў на першае паўгоддзе і графік адкрытых выхаваўчых мерапрыемстваў на 2014 - 2015 навучальны год.

Канферэнцыя ідэй “Псіхолага-педагагічная кампетэнтнасць класнага кіраўніка як умова паспяховага партнёрства з сям’ёй” была накіравана на ўдасканаленне работы класнага кіраўніка па фарміраванні культуры сямейных адносін, зберажэнне і ўмацаванне сямейных каштоўнасцей. Кожны з класных кіраўнікоў меў магчымасць падзяліцца сваім вопытам па арганізацыі ўзаемадзеяння з сям'ёй. Былі распрацаваны памяткі для бацькоў “Што перашкаджае ў зносінах з дзецьмі”. А таксама класныя кіраўнікі правялі адкрытыя класныя гадзіны ў рамках тыдня “Сям’я і школа – вырашаем праблемы разам”.

На праблемным семінары “Сістэмны падыход да рашэння праблемы фарміравання актыўнай грамадзянскай пазіцыі вучняў” класныя кіраўнікі засяродзілі ўвагу на эфектыўных формах і метадах у выхаванні асобы грамадзяніна і патрыёта. Сярод найбольш эфектыўных форм работы былі вызначаны паходы і экскурсіі, падарожжы, гульні-віктарыны, конкурсы народных гульняў, вусныя часопісы, прэс-канферэнцыі, сустрэчы з ветэранамі і таленавітымі землякамі, інфармацыйны рынг. Былі дадзены метадычныя рэкамендацыі па правядзенні інфармацыйных гадзін. Парфемчык Ю.М., педагог-арганізатар, расказала аб выкарыстанні магчымасцей дзіцячых грамадскіх аб’яднанняў для ўзмацнення ролі грамадзянска-патрыятычнага выхавання. Юлія Мікалаеўна засяродзіла ўвагу на дзейнасці дзіцячых грамадзянскіх аб’яднанняў у нашай школе. Класныя кіраўнікі прадставілі свае распрацоўкі выхаваўчых мерапрыемстваў “Вопыт работы па фарміраванні актыўнай грамадзянскай пазіцыі ў навучэнцаў”. Быў складзены метадычны веснік “Інавацыі ў адукацыі”.

У рамках дзейнасці педагагічнай майстэрні “Маё Я ў слове СЯМ’Я” быў абагульнены вопыт установы адукацыі па сямейным гендэрным выхаванні і прадстаўлены на раённай пляцоўцы “Уроки будущим мужьям и жёнам» .

У снежні Царык М.М., класны кіраўнік 10 класа і кіраўнік МА класных кіраўнікоў, прымала ўдзел у раённай канферэнцыі “Духовно-нравственное воспитание» з пытаннем «Роль классного руководителя в формировании духовно-нравственных качеств обучающихся».

Індывідуальная работа з класнымі кіраўнікамі на працягу навучальнага года ажыццяўлялася згодна іх запытаў і па ініцыятыве намесніка дырэктара па ВР . Кожны аўторак праводзілася міні-пасяджэнне класных кіраўнікоў, на якім абмяркоўваліся самыя надзённыя праблемы. Кансультацыйны пункт працаваў

у асноўным па суботах. Практыкавалася  такая форма метадычнай работы як кансультацыйная метадычная ўзаемадапамога настаўнікаў.

На працягу года усе класныя кіраўнікі дастаткова эфектыўна працавалі па асноўных накірунках, выхаваўчая работа вялася з улікам узроставых асаблівасцей вучняў, псіхалагічных і індывідуальных  здольнасцей, правоў дзяцей. Кожны класны кіраўнік  меў магчымасць прыняць удзел у рабоце МА: у абмеркаванні тэарэтычных пытанняў і правядзенні мерапрыемстваў па тэмах пасяджэнняў. Класныя кіраўнікі адказна падыходзілі да падрыхтоўкі адкрытых мерапрыемстваў. Аднак класныя гадзіны  ў большасці праходзілі ўсё ж  у традыцыйнай форме.

Класныя кіраўнікі  ўдасканальвалі сваё прафесійнае майстэрства  праз самаадукацыю. Вынікі работы былі прадстаўлены ў выглядзе рэфератаў, капілак класных кіраўнікоў.

Недахопамі ў арганізацыі работы МА класных кіраўнікоў можна лічыць малаэфектыўную сумесную працу класных кіраўнікоў, навучэнцаў і бацькоў, недастатковае выкарыстанне магчымасцей дзіцячых грамадскіх арганізацый. Класным кіраўнікам трэба больш актыўна ўдзельнічаць ў раённых конкурсах, актывізаваць удзел навучэнцаў у рэспубліканскіх акцыях ( “ Я грамадзянін РБ”, “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся”…). На недастатковым ўзроўні класныя кіраўнікі выкарыстоўваюць раённы друк для асвятлення  вопыту сваёй работы, недастаткова знаёмяцца з метадычнай літаратурай, якая адлюстроўвае сучасныя падыходы ў выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце.

Аналізуючы дзейнасць класных кіраўнікоў, можна зрабіць вывад, што работа вядзецца па ўсіх накірунках. Мерапрыемствы, праведзеныя на працягу навучальнага года, былі накіраваны на выхаванне  любові да сваёй Радзімы, адказнасці за свае ўчынкі, фарміраванне грамадзянска-патрыятычнай самасвядомасці, на  прафілактыку злачынстваў і правапарушэнняў, п’янства і іншых шкодных звычак, сцвярджалі  нешта новае, пашыралі межы пазнання , забяспечвалі інтэлектуальную актыўнасць. Аднак не патрэбна спыняцца на дасягнутым. Класнаму кіраўніку неабходна пастаянна павышаць свой узровень, засвойваць сучасныя выхаваўчыя тэхналогіі, вывучаць перадавы вопыт, развіваць сістэму выхаваўчай работы ў класе, разглядаць пытанні ідэалагічнай работы, узмацняць якасць работы з вучнямі па прафілактыцы правапарушэнняў, вывучаць здольнасці кожнага вучня. Зыходзячы з вышэй сказанага,  работа МА класных кіраўнікоў у 2015-2016 навучальным годзе будзе накіравана на вырашэнне наступных **задач:**

**-** стварэнне ўмоў для павышэння ўзроўня тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў класнага кіраўніка праз выкарыстанне традыцыйных і наватарскіх метадаў у пытаннях выхавання.

Кіраўнік МА класных кіраўнікоў М.М.Царык

Семінар-практыкум “Прымяненне новых тэхналогій выхаваўчага працэсу ў аспекце маральнага і ідэалагічнага выхавання” складаўся з тэарэтычнай і практычнай частак. Класным кіраўнікам былі прапанаваны выступленні “ Калектыўныя і групавыя формы работы з вучнямі” ( Пачэбут А.А. ), “ Калектыў як фактар развіцця асобы. Прынцып асобасна-арыентаванага падыходу ў выхаваўчай рабоце з вучнямі” (Шалкевіч Т.Г.), “ Выкарыстанне ІКТ у выхаваўчай рабоце”( Галась М.Ч.), “ Новыя падыходы да правядзення інфармацыйных гадзін”. Практычная частка прадстаўляла сабой абмен вопытам класных кіраўнікоў па дадзенай праблеме. Былі наведаны класныя гадзіны ў Савіцкай Я.М.( эка-дыскусія “ Жыць, каб эканоміць, ці эканоміць, каб жыць?”) , Шымко М.А.,( ролевая гульня “ Быць адказным – гэта… “). Створаная папка “ Метадычныя рэкамендацыі па правядзенні інфармацыйных гадзін” стане добрым дапаможнікам для класных кіраўнікоў пры падрыхтоўцы да інфармацыйных гадзін.

Пад час правядзення круглага стола “ Роля сям’і і школы ў прыцягненні дзяцей да здаровага ладу жыцця” асаблівы акцэнт быў зроблены на абмеркаванне праблем, з якімі сутыкаецца класны кіраўнік у рабоце з сям’ёй па прыцягненні дзяцей да здаровага ладу жыцця, на работу класнага кіраўніка і педагога сацыяльнага з нядобранадзейнымі сем’ямі. Класны кіраўнік 8б класа Карневіч Н.А. падзялілася сваім вопытам работы па тэме “ Узаемадзеянне сям’і, школы і соцыума ў выхаванні здаровай гарманічнай асобы”. Цікавым і змястоўным было мерапрыемства Крыцкай В.А. “ Сцяжынкамі здароўя”, дзе вучні разам з любімымі казачнымі героямі падарожнічалі па цікавых і часам заблытаных сцяжынках краіны здароўя, вучыліся быць здаровымі і душой і целам. Мерапрыемства было накіравана на выхаванне пачуцця сяброўства, узаемадапамогі, згуртаванне навучэнцаў і іх бацькоў.